Багданоўскай А.Г., студ. гр. 514 ФТБК і СМ
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Гуд П.А.,
канд. гіст. навук, прафесар

# ЛІЧБАВАЯ І КОЛЕРАВАЯ СІМВОЛІКА Ў АБРАДАВА – РЫТУАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

Ва ўсе часы абрады і рытуалы з'яўляліся спадарожнікамі чалавека ў яго грамадскім і сямейным жыцці. Каб зразумець сутнасць абрадаў, пакінутых нам у спадчыну продкамі, неабходна ведаць змест і семантыку розных рытуальных дзей, а таксама сэнс ужывання рытуальных атрыбутаў (вянка, ручніка, каравая і г.д.). У сучасных святах не заўсёды правільна раскрываецца сімволіка і семантыка рытуальных дзей і рэчаў: замест абрадавых страў на многіх святах ужываюць стравы ўсходніх народаў ( шашлыкі, плоў, лаваш, і інш.); з'яўляюцца новыя персанажы, якія не адпавядаюць народнай традыцыі і ўшчэнт разбураюць жанравую і стылёвую характарыстыку свят, іх нацыянальна адметныя рысы. Напрыклад, на Купаллі ў асобных раёнах Беларусі замест Купалінкі вядучым свята з'яўляецца Нептун - персанаж старажытнарымскай міфалогіі, што зусім не адпавядае беларускім святочным традыцыям і дае моладзі не правільную этнаарыентыроўку ва ўспрыняцці дзеі.

Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на багатую сімволіку колераў і лічбаў, бо нашы продкі верылі, што іх правільнае выкарыстанне прынясе дабрабыт, шчасце, здароўе. Асноўнымі колерамі ў беларусаў былі белы, чырвоны і чорны (трыада). Белы колер з'яўляўся колерам вечнасці, пераходу з аднаго становішча ў другое. Чырвоны колер быў колерам жыцця, сілы, энергіі, выконваў функцыю абярэгу. Асабліва аберагалі сябе жанчыны, робячы чырвоны арнамент на адзенні ў зонах-разрывах, праз якія магло быць нанесена энергетычнае пашкоджванне. Чорны колер сімвалізаваў зямлю, сувязь з продкамі.

Сваю ўвагу беларусы звярталі не толькі на колеры, але і на лічбы. Вялікае значэнне нашы продкі надавалі знаку "першы". І на самай справе, у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нашай культуры можна прасачыць лінію знака “першы”: напрыклад, першае рытуальнае купанне дзіця; першы выган жывёлы на пашу. Лічба два ў беларускай народнай культуры абазначала пару: пара птушак на вясельным караваі, дзве касы плялі маладой на зборную суботу. Лічба тры займае адно з галоўных месцаў у абрадах: 3 дні гулялі вяселле – пераход маладой пары ў новае сямейнае жыццё; 3 дні працягваліся праводзіны чалавека ў іншы свет – ад моманту смерці да пахавання; 3-ці дзень – дзень пахавання (першая памінальная  вячэра); першыя тры дні з’яўляюцца значнымі этапамі ў жыцці нованароджанага. Лічба чатыры звязана з чатырма асноўнымі святамі сонечнага календара: Каляды, Вялікдзень, Купалле, Багач. Лічба пяць у язычніцкія часы з’яўляецца сімвалам аховы чалавека. Лік шэсць быў не вельмі распаўсюджаны ў культуры беларусаў. Магчыма лічба шэсць выкарыстоўваўся ў магічна-абрадавай практыцы калдуноў. Восем можна сустрэць на вяселлі, калі маладым перавязвалі рукі крыж-накрыж ручніком, каб завесці пад абразы. Два галубкі на вясельным караваі, перавязаныя паміж сабою таксама ўтваралі васьмёрку. Лічба дзевяць асацыіравалася з першым рытуальным купаннем дзіцяці; з “перазовамі”, калі бацькі маладога едуць да бацькоў маладой і святкуюць “сваё” вяселле; за другі жалобны стол садзілася толькі дзевяць чалавек. Дванаццаць асацыіруецца з дванаццацю месяцамі, таксама сустракаецца ў народных замовах  рознай лячэбна-прафілактычнай накіраванасці. З дванаццаці год складаюцца цыклы зямнога жыцця чалавека – перыяд развіцця, станаўлення, своеасаблівага пераходу ў групу дарослых людзей. Заўсёды з негатывам успрымалася лічба трынаццаць. Такая радаслоўная за гэтай лічбай вядзецца яшчэ з язычніцкіх часоў, калі па віне трынаццатага няпрошанага госця, бога сваркі і разладу Локі, было сапсавана свята і загінуў любімец багоў Бальдр. Сорак выкарыстоўваўся ва ўніверсальным  рытме традыцыйнай культуры: на 40-ы дзень адбываюцца хрэсьбіны дзіцяці; у вясельным цыкле з 9 дня па 40 працягваўся мядовы месяц у маладых; у памінальным абрадзе на 40-ы дзень адбываўся трэці жалобны стол. З лічбай сорак асацыіруецца народнае свята Саракі, таму ў гэты дзень выпякалі сорак якіх-небудзь печаных вырабаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У беларусаў цотная колькасць сімвалізавала жыццё, а няцотная – смерць. Цотная колькасць асацыіравалася з парнасцю: на зборную суботу дзяўчыне заплятали дзве касы, бо яна была ў пары; на вясельным каравае было дзве птушачкі. А вось няцотная колькасць атрыбутаў выкарыстоўвалася на пахаванні: тры жмені зямлі кідалі на труну; на памінальны стол ставілі няцотную колькасць страў.

З прыходам хрысціянства некалькі іншую інтэрпрэтацыю атрымалі колеры і лічбы. Чырвоны колер стаў сімвалізаваць Хрыста, кроў; белы – святасць; чорны – пакуты, смерць; блакітны – Багародзіцу, чысціню неба; жоўты – нябеснае багацце. Лічба тры звязвалася з святой Троіцай: Бог – бацька, Сын і Святы Дух. Лічба сем пранізвае сваім існаваннем ўсё хрысціянства: за сем дзён Бог стварыў свет; Вялікі пост доўжыцца сем тыдняў; за сем тыдняў да Вялікадня (Пасхі) адзначалася Вербная нядзеля; святкаванне Троіцы прыпадае на сёмы тыдзень пасля Вялікадня. Дванаццаць цесна звязаны з Боскім пачаткам: дванаццаць валхвоў прынеслі падарункі народжанаму Хрысту; у Сына Божага было дванаццаць апосталаў. А вось лічба трынаццаць зноў успрымаецца негатыўна. Гэта звязана з Тайнай вячэрай, на якой прысутнічала трынаццаць асоб, адной з іх быў Іуда, які здрадзіў і выдаў Хрыста. Лічба трыццаць тры асацыіравалася ў хрысціян з Ісусам Хрыстом. Ісусу было трыццаць тры гады, калі яго распялі на крыжы. На саракавы дзень душа памёршага прадстае перад Богам; прыкладна сорак дзён паміж галоўнымі святамі нашага календара; сорак дзён доўжыўся пост Ісуса Хрыста. Лічба семдзесят асацыіравалася з 70-дзённым адрэзкам часу, які ішоў за Пасхай. Гэты перыяд быў звязаны з пасмяротнымі з'явамі ў жыцці Ісуса да самага Ўзнясення.

У гады савецкай улады змянілася сімволіка некаторых колераў і лікаў, а на многія нават не звярталася ўвага. Напрыклад, чырвоны колер стаў колерам волі, барацьбы супраць прыгнечання, белы сімвалізаваў зняволенне, уладу буржуазіі, часовага ўрада, а чорны колер звязваўся з пакутамі, вайной, смерцю. Важнае значэнне ў савецкі час надавалася лічбе чатыры, бо яна сімвалізавала кожнага чацвёртага загінуўшага ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На жаль у наш час, выкарыстанне сімволікі колераў і лічбаў у святах не заўсёды адпавядае нашай духоўнай і гістарычнай традыцыі. І ў выніку гэтага пры святкаванні язычніцкіх Каляд, напрыклад, выкарыстоўваецца шасціканцовая хрысціянская калядная зорка; на Купалле хлопцы і дзяўчаты прыгаюць праз вогнішча парамі, але не ведаюць значэння гэтай рытуальнай дзеі; маладая на вяселле не заўсёды апранае белае адзенне, што супярэчыць народным традыцыям; наваробджаных перавязваюць блакітнай і ружовай стужкамі, а не чырвонай, як было раней і г. д.

І нягледзячы на тое, што час ідзе, што змяняюцца жыццёвыя прыярытэты, мы не павінны цурацца народных традыцый, сваёй гісторыі, бо гэта нашы карані, падмурак, які дае нам сілы для далейшага развіцця. Гэта датычыцца і сімволікі колераў і лічбаў: няведанне лічбавай і колеравай сімволікі вядзе да разбурэння святочнай народнай традыцыі.

Пры выкарыстанні колераў і лічбаў у святах, рэжысёр павінен добра ведаць іх значэнне, каб не было ніякіх недарэчнасцей і непаразуменняў. Таму вывучэнне, асэнсаванне і ўкараненне ў сучасную святочную практыку лічбавай і колеравай сімволікі беларускага традыцыйнага свята, з’яўляецца актуальным і сацыяльна значным, мае тэарэтычнае і практычнае значэнне.

Літаратура:

1. Гуд П.А. Беларускае Купалле: кампазіцыя і семантыка абрадавых дзей. – Мн., 2006.

2. Конович А.А. Театрализованные праздники и обряды СССР. – Мн., 1990.

3. Крук І.І. Сімволіка беларускай народнай культуры. – Мн., 1993.

4. Ліцвінка В.Д. Святы і абрады беларусаў. – Мн.1997.

5. Похлёбкин В.В. Международная символика и эмблематика. – М., 1989.

6. Туманов И.М. Режиссура массового праздника и театрализованного концерта. – М., 1976.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ